№ 7(60) • КАСТРЫЧНІК 2014

ЮБІЛЕЙКА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ



РАВАРЫСТЫ Ў ШОКУ

як берасцейскія ўлады роварныя сцежкі малююць



Замест таго, каб пабудаваць роварныя сцежкі ўлады Берасця іх намалявалі, накрэсліўшы дзве лініі на тратуары. Такім чынам паўстала каля пяці кіламетраў дарогі для ровараў на вуліцы Маскоўская.

На такім шляху раварыстаў чакае шмат сюрпрызаў – лаўкі, сметніцы, слупы, яміны. Пры гэтым рухацца можна максімум у адзін бок, у процілеглых напрамках раварысты ніяк не раз'едуцца.

Але галоўная праблема – пешаходы, якія так і не зразумелі, што ў іх забралі палову ходнікаў. І яны працягваюць рухацца там, дзе па версіі берасцейскіх уладаў зараз маюць ездзіць ровары, што стварае небяспеку для жыцця і здароў'я.

Каб высветліць якая арганізацыя зрабіла такія небяспечныя сцежкі, belsat.eu давялося зрабіць з дзясятак тэлефонных званкоў. Берасцейскі гарвыканкам не дае інфармацыі неакрэдытаваным СМІ. Будаўнічыя арганізацыі адна за адной адхрышчваліся ад будаўніцтва такой дарожкі.

Патэлефанавалі ў прэс-службу абласнога ДАІ. «З намі мусяць узгадняць падобныя аб'екты, але з намі ніхто нічога не ўзгадніў, так што вы не па адрасе», - заявілі там.

Бліжэй вечару ўсё ж удалося выйсці на след выканаўцы – Рэспубліканскага ўнітарнага мантажнага-эксплуатацыйнага прадпрыемства «СМЭП ДАІ» упраўлення ўнутраных спраў берасцейскага аблвыканкаму. Там пацвердзілі, што гэта іх арганізацыя рабіла сцежку і разметку на ёй, і што ўсё зроблена ў адпаведнасці з прынятымі нарматывамі. На іншыя пытанні ў арганізацыі адказваць адмовіліся – сакрэтам аказалася нават даўжыня і шырыня пабудаванай сцежкі.

А ў нас пытанні засталіся: чаму замест рэальнага будаўніцтва інфраструктуры ўлады займаюцца адкрытай прафанацыяй? Колькі грошай падаткаплацельшчыкаў было выдаткавана на псеўдароварную сцежку? І ці нехта за гэта адкажа?

belsat.eu



ВЕЛО ДРАГ-РЕЙСИНГ В БРЕСТЕ

4 октября кампания «За Вело-Брест!» посетила очередное мероприятие в рамках осеннего велосезона. Организаторами выступила инициатива BikeBrest, а именно Алексей Волков и Роман Матусевич.

– Это уже не первое мероприятие, которое мы организовываем для велосипедистов и стараемся преподнести участникам что-то новое, не просто банальную прогулку на велосипеде. Радует, что на мероприятия каждый раз приезжают новые велосипедисты, значит то, что мы делаем, востребовано и интересно брестчанам, – отметили организаторы.

Для участников мероприятия был организован Драг-рэйсинг на велосипедах. Заезд проходил на стадионе Гребного канала. Все желающие могли соревноваться друг с другом на дистанции 500 метров. Победителям были вручены призы, а всем участникам памятные грамоты.

Другой частью мероприятия была обзорная поездка по городу. Организаторы подготовили интересный маршрут по достопримечательностям города.

Стоит отметить одного из участников, который приехал на ретро – велосипеде минского завода, 1987 года выпуска:

– Его еще моя мама для себя покупала тогда, когда я был школьником. А теперь я езжу и своим детям в наследство оставлю. Ведь этот велосипед очень удобен в эксплуатации и детали к нему можно подобрать в любом магазине велозапчастей. Это вам не импортные GAINT и CUBE, к которым детали не так то и сразу найдешь. А мой Аист еще все импортные переживет, главное вовремя смазывать! :)



И как обычно, завершающей частью мероприятия был костер на берегу озера. Барбекю, дискотека при луне, разговоры и посиделки у костра, что может быть лучше после хорошего заезда?

– Проведение подобных мероприятий популяризирует веловдвижение в нашем городе. А так же все участники учатся соблюдать Правила Дорожного Движения при езде на велосипеде, что особенно актуально в последнее время, – отметил Марк Антонов, заместитель координатора кампании «За Вело-Брест!»

dzedzich.org

В БРЕСТЕ ВИРТУАЛЬНОСТЬ БУДЕТ ВЛИЯТЬ НА РЕАЛЬНОСТЬ

В Бресте с 1 ноября стартует «медиа-школа» для активной молодежи «Виртуальность для реальности». Инициатором проведения является брестская молодежная инициатива «ОАЗИС».

Основные слоганы школы «Хочешь стать известным в соцсети? Хочешь миллионы просмотров своей страницы? Хочешь влиять на жизнь города, страны?»

«Школа» это серия занятий по созданию и продвижению «вирусной» интернет-продукции (видеороликов, флеш-анимации, фотографий, фотожаб, мемов и т.п.), а также выполнения участниками ряда самостоятельных и групповых заданий по актуальным для города вопросам.

Участники освоят технические навыки работы с фото, видео и флеш-анимацией и познакомятся с молодежными инициативами города.

Занятия в школе бесплатны и разделены на три тематических блока:

1) Работа с фото: от способов создания изображения до его обработки и основ фотожурналистики;
2) Работа с флеш-анимацией: анимация движения, текстовая анимация, работа со звуком и др.;
3) Работа с видео: правила съемки, видеорепортаж, монтаж и др..



Выпускной в «школе» пройдёт в виде интернет-конкурса на лучшую работу в своей категории. Победителей наградят ценными призами.

– В нашей школе не будет скучных лекций и занудной теории, все силы будут направляться на освоение практических навыков и актуализацию городских проблем. Занятия будут проводить одни из лучших брестских специалистов в области фотографии, флеш-анимации и видеосъёмки, которые и подскажут начинающим свои небольшие и большие секреты – отметила Ирина, координатор инициативы «Оазис».

Для того чтобы стать участником медиа-школы «Реальность в виртуальности» необходимо отправить запрос для получения анкеты на электронный адрес: oazis.brest@gmail.com.

Все вопросы можно задать
ВКонтакте: vk.com/aazis_berasce,
по телефону: 029-228-11-25 (Ирина),
по е-мейл: oazis.brest@gmail.com.

dzedzich.org

"ЗРОБІМ ЛЕПШ" У БЕРАСЦІ

Адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў кампаніі "Зробім лепш!" у Брэсце.

30 верасня падчас урачыстага сходу адбылося ўзнагароджанне лепшых зборшчыкаў подпісаў кампаніі "Зробім лепш!" у Брэсце.



Нагадаем, што ў гэтым годзе грамадская кампанія "За вела-брэст!" ладзіла акцыю "На ровары без межаў".

Сутнасць кампаніі – дамагчыся пераезду на ровары праз мяжу з Польшчай у пункце пропуска "Варшаўскі мост". У межах акцыі адбылося шэраг мерапрыемстваў сярод якіх раздача ўлётак, збор подпісаў да памежных камітэтаў, вандроўка ў Польшчу.

– Вынікі кампаніі сведчаць, што грамадзяне Польшчы і Беларусі за тое каб межаў для раварыстаў не існавала. Падчас усіх мерапрыемстваў мы адчувалі вялікую падтрымку людзей. Дзякуй усім хто нам дапамагаў, а таксама нашым новым польскім партнерам "LublinRowerem"з якімі мы наладзілі стасункі дзякуючы гэтай кампаніі – адзначыў Марк Антонаў, намеснік каардынатара кампаніі "За вела-Брэст!"

dzedzich.org

ШТРАФ ЗА ВЕЛОПРОБЕГ

Одного из организаторов ночной велопокатушки наказали штрафом

Напомним, в последние выходные последнего летнего месяца этого года, в Бресте около 300 велосипедистов откликнулись на «клич», брошенный минским проектом ВелоДиско, и собрались у «Короны», чтобы покататься по ночному городу.



Перед началом оказалось, что организаторы не рассчитывали на такое большое количество велосипедистов, не зарегистрировали в установленном порядке массовое мероприятие, не приготовили толковой программы, и даже маршрут выбрали очень неудобный, без учёта специфики нашего города. Однако, от своей идеи было отказываться поздно, и покатушка состоялась...

Правда, велосипедисты уже на первой точке (парк Воинов-интернационалистов) поняли, что им предстоит лишь ездить из точки в точку, что они и так могут делать, как и когда захотят. В результате образовалась неуправляемая толпа, по частям двинувшаяся в сторону крепости. Уже на Советской никого из организаторов с основной группой не было, в крепости все окончательно «разбрелись» по городу.

Позже стало известно, что организаторы попытались откреститься от мероприятия, и стали удалять информацию из социальных сетей, где и проходила реклама, однако правоохранительным органам удалось восстановить всю цепочку, и вот сегодня стало известно, что один из тех парней, кто выступал в роли организатора, наказан штрафом в размере 3 млн. рублей.

Информация об этом была опубликована в группе ночных велопокатушек, которые до этого с успехом и безболезненно для организаторов проходили в других городах Беларуси:



Дорогие друзья!

Сегодня случилось то, что должно было случиться.

Создателя велодвижения «Ночной велопробег» Влада Пацкевича сегодня штрафанули на 3 000 000 рублей за «велопробег» в городе Бресте «За организацию несогласованного массового мероприятия».

Это очень печально, ведь порядок мы не нарушаем, а делаем городу и людям только хорошее.

Ради вас, дорогие велолюбители, ради ваших улыбок проект «Ночной велопробег» не прекращает существование!

Но знайте, что инициатива наказуема.

Надо сказать, что Брест не просто так стал «камнем преткновения» в этом деле, наш город уже видел подобные проекты, и всегда они были необычайно массовыми, но с успехом проходили лишь потому, что заранее было налажено взаимодействие организаторов и властей города.

Именно такого велопраздника ожидали велосипедисты и на этот раз, а не получив его, банально вышли из-под контроля организаторов.

Виртуальный Брест

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ. ШЛЯХІ ЯДНАННЯ

Адзінай мэты не зракуся,
І сэрца мне не задрыжыць:
Як жыць – дык жыць для Беларусі.
А без яе – зусім не жыць.

Л. Геніюш

На жаль, мы жывем у ганебны час, калі патаптаны ўсе свабоды і правы грамадзян: свабода слова, свабода веравызнання, свабода сходаў.

Сучасныя беларускія ўлады душаць дротам не толькі нас, але і нашу творчасць, нашу мару, нашы думкі. І ў гэтых умовах кансалідаваць, аб'яднаць нацыю можа толькі вяртанне да сваіх нацыянальных каранёў.

Беларусы – маладая, поўная сіл і надзей нацыя, якая проста абавязана аднавіць нацыянальную памяць, памяць, якую стагоддзямі знішчалі ворагі Беларусі і яе народа. У гэтай самай нацыянальнай памяці і хаваецца той падмурак, які можа кансалідаваць нас як адзіны нязломны маналіт пад назвай беларусы. Мы павінны ўспомніць пра сваіх нацыянальных герояў, бо ў кожным з нас жыве часцінка душы Скарыны, Купалы, Каліноўскага, Быкава.



У сэрцы кожнага з нас ёсць парастак беларушчыны, які абавязкова прарасце. Якія б моцныя вятры на дзьмулі над краінай мы павінны адчуць сябе часткай адзінай нацыі, нацыі з тысячагадовай гісторыяй, нацыі паэтаў, навукоўцаў, нацыі мастакоў і Нобелеўскіх лаўрэатаў. І не важна да якой нацыянальнасці мы належым: да беларусаў, украінцаў, палякаў, габрэяў або расейцаў. Важна толькі тое, што нам выпала доля жыць, працаваць, ствараць сем'і і нараджаць дзяцей у краіне, назва якой – Беларусь. І мы павінны зрабіць усё магчымае, што б захаваць сваю мову, сваю культуру, традыцыі і звычаі, бо без гэтага кансалідацыі нацыі не ўяўляецца магчымай.

Усё гэта з'яўляецца падмуркам нашага агульнага беларускага дома, які мы павінны будаваць для нашых нашчадкаў. Сапраўдная кансалідацыя нацыі магчыма толькі пры ўмове абсалютнай талерантнасці і гнуткасці кожнага члена грамадства на падставе агульнай, вышэйшай ідэі будаўніцтва беларускага дома ў кантэксце агульнаеўрапейскай інтэграцыі.

Як сказаў Куденховэ-Калергі "Пан-Еўропа – гэта ўся Еўропа", уключаючы Беларусь. Змены не прыйдуць лёгка. Трэба будзе чымсьці ахвяраваць, сутыкацца са складаным выбарам і прымаць з адкрытым забралам непрыемную праўду. Але я абсалютна ўпэўнены, што выбіраючы агульнаеўрапейскі шлях развіцця і аб'ядноўваючы менавіта на гэтай падставе нацыю, мы не памылімся ў выбары. І менавіта гэты выбар стане ў выніку для нас лёсавызначальным.

Першыя крокі заўсёды самыя цяжкія. Здаецца, што нічога не атрымаецца, што няма моцы, магчымасцяў. Але нягледзячы на ўсё гэта, мы павінны рухацца наперад, пераадольваць усе перашкоды на шляху да нашай мары: жыць у адзінай, свабоднай краіне, дзе людзей не будуць дзяліць па прыкмеце іх палітычных пераваг, дзе кожны будзе адчуваць сябе сціпла і ўтульна. Дзе кожны будзе сваім.

Э. Берк сказаў: "Каб зло перамагло, добрым людзям дастаткова нічога не рабіць. Так давайце ж, нарэшце, пачнем нешта рабіць дзеля таго каб змяніць нашу краіну, каб яна расправіла плечы, распусціла косы і заняла "свой пачэсны пасад між народамі".

Давайце ж палюбім нашу краіну ўсім сэрцам, усёй душою, бо гэта наш край, наша зямля, зямля беларуская. Наша зямля – гэта маўклівая памяць аб нязьдзейсненай надзеі, маўклівае сведчанне, якое чакае свайго часу. І хто ведае, можа мы адправімся ў падарожжа па гісторыі, якое замкне гэтае кола. І памятай, беларус, што самы цёмны час перад світаннем.

Жыве Беларусь!
Жыве Вечна!

Фарнэль Алесь

ПРЕДСЕДАТЕЛЕЙ ЖСПК УЧАТ, КАК ОБЕСПЕЧИТЬ ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

23 октября в здании ДК профсоюзов состоялась традиционная встреча руководства администрации Московского района г. Бреста, представителей Московского РОВД, других организаций и служб с председателями жилищных кооперативов и товариществ собственников, зарегистрированных на территории района.

Глава администрации района Вадим Кравчук акцентировал внимание собравшихся на вопросах подготовки к зиме, проведения месячника по благоустройству и обеспечения чистоты и порядка на прилегающей к домам территории, профилактики краж личного имущества граждан.

Также обсуждались иные проблемы обеспечения жизнедеятельности жилищных кооперативов.

Виртуальный Брест





ЮБІЛЕЙКА
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

• **Заснавальнік** – Суполка "Усход-2" гарадской арганізацыі Партыі БНФ
• Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранага карыстання
• **Падпісана ў друк** 29.10.2014 года ў 14-00
• Папера афсетная, 0,5 ул.-друк. аркуша, фармат А4. **Гарнітура** Helios.
• Надрукавана на памнажальнай тэхніцы сябраў рэдакцыі.
• **Наклад:** 299 асобнікаў.
• Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
• **Галоўны рэдактар:** Таццяна ГЕНДЗЕЛЬ
• **Рэдакцыйная калегія:** Наста ПАПЯЛОЎСКАЯ, Кірыл КАТОВІЧ, Ульяна ВЕНЦЭЛЬ.
• **Кантактны тэлефон: (029) 222-58-22, (029) 660-57-41.**
• **E-mail:** jubilejka@tut.by